Так, во всех учебных планах высшего специального образования первый раздел предназначен для объединения учебных дисциплин гуманитарной направленности. Здесь поясняется, какие это дисциплины, сколько часов требуется, чтобы полно решать конкретные задачи в единой системе достижения четко сформулированной цели образования, обеспечивающей эффективное функционирование общества на определенном этапе его развития. Такой же подход требуется и к остальным разделам плана: общенаучному, общепрофессиональному, дисциплинам специальностей и специализаций.

Не менее сложной и важной проблемой является определение и увязка целей и задач образования в учебных планах разных уровней, начиная со школьного образования. Важно не упустить из виду главную цель -- обеспечение здорового и гармоничного развития общества. Она должна проходить красной нитью через все учебные планы разных уровней образования.

Решать эффективно эти и другие связанные с ними задачи образования под силу только специальному научно-исследовательскому институту, который бы фундаментально и комплексно занимался разработкой и совершенствованием учебных планов в соответствии с происходящими изменениями в разных областях жизнедеятельности общества, используя в своих исследованиях передовой опыт и привлекая к работе квалифицированные педагогические кадры разных уровней образования: головных вузов, техникумов /колледжей/ и школ /гимназий/.

М.П.Сінькевіч, дацэнт
/Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

## КАДРАВАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСА

За гады існавання універсітэт падрыхтаваў больш за 50 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі рэспублікі і за яе межамі.

У цяперашні час на сямі факультэтах універсітэта вучыцца 9765 студэнтаў дзённай і завочнай формаў навучання, 52 іншаземнянавучэнцы з 21 краіны Еўропы, Азіі і Афрыкі, 1478 чалавек набываюць другую вышэйшую адукацыю ў Вышэйшай школе кіравання і бізнесу.

Падрыхтоўку спецыялістаў на 34 кафедрах універсітэта ажыц-

цыўляюць 593 штатныя выкладчыкі і 17 штатных навуковых супрацоўнікаў, 6 акадэмікаў, 10 членаў-карэспандэнтаў, 48 прафесараў, 277 дацэнтаў, 41 доктар навук, 342 кандыдата навук, 2 магістры. Акрамя гэтага, на 28,25 пасадах працуюць 64 знешнія сумяшчальнікі, з якіх 1 акадэмік, 1 член-карэспандэнт, 3 прафесары, 15 дацэнтаў, 11 дактароў навук і 22 кандыдаты навук.

Высокі прафесіяналізм і значная матэрыяльна-тэхнічная база дазволілі універсітэту перайсці да двухузроўневай сістэмы падрыхтоўкі -- бакалаўраў і магістраў эканамічных навук.

Пры БДЭУ працуе аспірантура і дактарантура, дзе займаецца 103 аспіранты, 17 дактарантаў, 109 саіскальнікаў. Дзейнічаюць 4 саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый і адзін савет па абароне кандыдацкіх дысертацый.

Вучэбны працэс арганізаваны ў пяці вучэбных карпусах агульнай вучэбнай плошчай 31493 $м^2$. На аднаго студэнта прыпадае 6,3 $м^2$. Заняткі праводзяцца ў дзве змены. Маецца 27 лабараторый, плошча якіх складае 1220 $м^2$. Сярэдняя загружанасць -- 54 %. 23 аудыторыі аснашчаны тэхнічнымі сродкамі навучання, іх сярэдняя загружанасць складае 20 %.

Ва універсітэце налічваецца 430 ПЭВМ розных тыпаў і адзін камплект "Карвет". З іх 66 % /284 -- новыя машыны класа IBM 286/386/486, набытыя ў 1992--1995 гг., што дазволіла рэзка павысіць узровень выкладання інфармацыйных тэхналогій і спецыяльных дысцыплін з прымяненнем сучаснага праграмнага забеспячэння.

Створаны сем факультэцкіх лабараторый, якія аб'ядналі дзесяць вучэбных аудыторый, устаноўлены чатыры лакальныя сеткі, на якіх адпрацоўваюцца новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў вучэбным працэсе па матэматыцы, інфарматыцы, а таксама па ўсіх спецыяльных дысцыплінах.

Усяго ва універсітэце маецца 26 аудыторый, аснашчаных ПЭВМ розных тыпаў і мадыфікацый у колькасці ад 5 да 16 машын у кожнай. Сярэдняя загружанасць аудыторый у дзень -- ад 5 да 9 гадзін на машыну / 75 %/.

Вядзецца работа па стварэнні інфармацыйнай сеткі універсітэта з падсістэмамі АСУ "рэктарат", "апарат кіравання", "бухгалтэрыя", "бібліятэка", "вучэбна-метадычнае упраўленне".

Устаноўлена аўтаматызаваная бібліяграфічная сістэма, аўтаматызуецца бухгалтарскі ўлік, планава-фінансавая работа, ажыццяўляецца падрыхтоўка да ўстанаўлення падсістэмы разліку вучэбнай

нагрузкі і штатаўпрафесарска-выкладчыцкага саставу, уліку кадраў і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Кніжны фонд бібліятэкі універсітэта складае 892 785 экземпляраў, у тым ліку:

навуковай літаратуры -- 266 833 /30 %/;
вучэбнай літаратуры -- 522 696 /58,5 %/;
мастацкай літаратуры -- 58 799 /6,5 %/;
па беларускай мове -- 19 707 /2,2 %/.

50 % усіх паступленняў ідзе за кошт метадычных дапаможнікаў БДЭУ. Штогод амаль на 30 % павялічваецца колькасць назваў набытых выданняў, у асноўным за кошт набыцця навуковай літаратуры. Кнігазабяспечанасць студэнтаў складае ў сярэднем 73 выданні на чалавека. Па асобных дысцыплінах гэты паказчык складае 100 % -- філасофія, вышэйшая матэматыка, паліталогія, эканамічная гісторыя.

11 % ад усіх паступленняў у бібліятэку складаюць часопісы. У гэтым годзе бібліятэка выпісала 337 назваў газет і часопісаў. Адсутнасць дастатковых сродкаў не дазваляе ў неабходнай колькасці камплектаваць падручнікі і часопісы Расійскай федэрацыі і іншых зам жных краін.

Створаны спрыяльныя ўмовы для работы студэнтаў, працуе 5 абанементаў і 5 чытальных залаў, 18 кафедральных і кабінецкіх бібліятэк. З гэтага навучальнага года ў інтэрнаце 6 працуе філіял бібліятэкі, фонд якога ўключае большасць неабходных падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, а таксама мастацкую літаратуру і перыёдыку.